# *Установа культуры «Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна – краязнаўчы музей» запрашае*





***Першых наведвальнікаў музей прыняў 2 лютага 1968 года. Яго адкрыццё было прымеркавана да 130-годдзя з дня нараджэння Кастуся Каліноўскага.***






Літаратурна-
краязнаўчы
музей

***Этнаграфічны аддзел – найбольш цікавы для турыстаў. Тут можна пазнаёміцца з бытам, ладам жыцця беларускіх сялян першай паловы ХХ стагоддзя.***







**_Куток гаспадыні_**



# Покуць



**Сені**



**Камора**

# *1-ая зала – «Літаратурны свет Бацькаўшчыны»*

***Матэрыялы першай залы экспазіцыі знаёмяць з гісторыяй музея***



***Таксама тут прадстаўлены экспанаты, звязаныя з імёнамі знакамітых беларусаў: Францыск Скарына, Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч…***



**Зборнік “Дудка беларуская” 1896 г**- якому больш за сто гадоў. Імя аўтара гэтай кніжачкі,Францішка Багушэвіча. Гэты зборнік у музеі лічыцца амаль арыгінальным. Падчас экскурсіі вы пачуеце змястоўны аповед пра гэты і іншыя друкаваныя выданні беларускай літаратуры канца XIX-XXст.




БЕЛАРУСКІЯ ВЫДАВЕЦТВЫ І ВЫДАЎЦЫ ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XX СТА
HOMAN
BIEŁARUS

# 2-ая зала -«Літаратурны свет Бацькаўшчыны»

***Экспазіцыя другой залы знаёміць з матэрыяламі пра Янку Купала, Якуба Коласа, Янку Брыля і многіх іншых пісьменнікаў,* якімі багата наша зямля.**




У школе, тэатры і з кожнай трыбуны –
Хай чуюцца нашы пявучыя гукі.
Ад сэрца да сэрца – ці свята ці будні –
Ідзі мая мова, ідзі без прынукі!

І так па-дзяржаўнаму смела і горда
Трымайся заўсёды – і дома і ў свеце,
Каб шчасце – гарачаю хваляй да горла
Каб слезы – буялі, як росы дасвеццем!


19
32






М. ЯВАР
МІХАСЬ ЯВАР


Літаратура нараджаецца з глыбінь народнай душы
Адам Міцкевіч
ВАСІЛЬ БЫКАЎ
ЯНКА БРЫЛЬ

# *Зала -«Народнае ткацтва»*

***Экспазіцыя знаёміць з працэсам ператварэння раслінкі ў нітачку, а таксама знаёміць з прыладамі працы, якімі карысталіся нашы продкі.***







**Жаночы касцюм.** Зборны
1930-1940-я гг.
Мастоўскі раён



**Касцюм мужчынскі**

Першая чвэрць XX ст.

Наш адрас: в. Гудзевічы
вул.Цэнтральная, 7
Мастоўскі раён
Гродзенская вобласць
Тэлефон: 8-015-15-38-7-82

Шчыра запрашаем!!!

# *Зала -«Народнае ткацтва»*

***Экспазіцыя знаёміць з унікальнай калекцыяй  падвойных дываноў***




1936


1990г
1990г
ГУДЗЕВІЧЫ 1999г




1. Дыван падвойны (двухасноўны). Воўна. 1926 г.
   Вёска Індура Бераставіцкага раёна
2. Ходнік падвойны (двухасноўны). Воўна. 1930-я гг.
   Вёска Масаляны Бераставіцкага раёна
3. Ходнік падвойны (двухасноўны). Воўна. 1932 г.
   Вёска Гудзевічы
4. Дыван падвойны (двухасноўны). Воўна. 1900 г.
   Ткала Эмілія Палубінская (свякроў Ларысы Геніюш)
5. Дыван падвойны (двухасноўны). Воўна. 1898 г.
   Вёска Індура Гродзенскага раёна
6. Дыван падвойны (двухасноўны). Воўна. 1920-я гг.
   Вёска Індура Гродзенскага раёна

7-8. Дыванкі падвойныя (двухасноўныя). Акрыл. 1990 і 1998 гг.
Ткала В.І. Белакоз з вёскі Лятkі Мастоўскага раёна

9-11. Дываны падвойныя (двухасноўныя). Акрыл. 1990-я гг.
Ткала В.І. Белакоз з вёскі Лятkі Мастоўскага раёна

Двухасноўнае ткацтва, якое дазваляе атрымліваць падвойныя дывановыя тканіны, характэрна для заходніх раёнаў Гродзенскай вобласці. Гэты від ткацтва вядомы ў некаторых краінах Еўропы, у тым ліку ў суседняй Польшчы.

Падвойныя тканіны, так званыя “гродзенскія дываны”, займаюць асобае месца ў беларускім народным ткацтве. Ткуць іх з чыстай воўны, ніткі фарбуюць хатнімі сродкамі. Для асновы і ўтоку бяруць ніткі двух кантрасных колераў. У цэнтральным полі дывана ўзор складаецца з раслінных матываў, а па бардзюры - з геаметрызаваных фігурак дзяўчат і хлопцаў, звяроў і птушак. У канцы XIX стагоддзя ў сюжэтна-арнаментальныя кампазіцыі падвойных дываноў трапілі выявы руж, купідонаў, ірысаў, што сведчыла аб уплыве стылю мадэрн. Цяпер дываны ткуць толькі асобныя майстрыхі, змяніўся і знешні выгляд тканін: сюжэтныя кампазіцыі амаль адсутнічаюць, у дэкоры пераважае геаметрычны і раслінны арнамент.

Традыцыйнай тэхніцы ткацтва падвойных дываноў у 2011 годзе пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.




ПР.ГУ ДЕВ.ЦЕРКВИ.1932.Г.